# Даследаванне

SA #04/2015BE, 16 снежня 2015 г.

Belarusian Institute for Strategic Studies

# КРАІНАВАЯ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСІ: КАРОТКІ АГЛЯД АСНОЎНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ

**Аляксандр Аўтушка-Сікорскі**

## Уводзіны

З 2011 года ў дыскурс беларускіх уладаў трывала ўвайшлі сцвярджэнні пра неабходнасць павышэння краінавай канкурэнтаздольнасці. І хоць у большасці выпадкаў улады казалі пра беларускі экспарт, усё часцей сталі гучаць размовы аб канкурэнтаздольнасці краіны ў цэлым, не абмяжоўваючыся адной толькі неабходнасцю павышэння прывабнасці беларускіх тавараў на знешніх рынках.

Павышэнне пазіцый Беларусі ў міжнародных рэйтынгах упершыню з’явілася як адзін з напрамкаў дзейнасці ўрада ў Праграме дзейнасці Урада Рэспублікі Беларусі на 2011–2015 гады[12]. Акрамя таго, выказванні пра неабходнасць павышэння краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі рэгіёну сталі гучаць у публічных выступах Кірылы Рудога, прызначанага памочнікам прэзідэнта Беларусі па эканамічных пытаннях у чэрвені 2013 года.

Мэтай дадзенай працы з’яўляецца вызначэнне месца Беларусі сярод краін рэгіёну па ўзроўні асноўных паказчыкаў краінавай канкурэнтаздольнасці, а таксама кароткае апісанне дынамікі гэтых паказчыкаў.

Цяжкасць з аналізам канкурэнтаздольнасці Беларусі заключаецца ў тым, што асноўныя міжнародныя рэйтынгі, якія вымяраюць канкурэнтаздольнасць – рэйтынгі Institute of Management and Development (IMD) і World Economic Forum (WEF) – не бяруць да ўвагі Беларусь праз недавер да статыстычных дадзеных. Гэта стварае праблему колькаснай ацэнкі ўзроўню канкурэнтаздольнасці Беларусі, якая можа быць вырашана ў два спосабы. Адзін спосаб прадугледжвае самастойны разлік пазіцыі Беларусі ў рэйтынгах IMD або WEF з выкарыстаннем іх метадалогіі. Гэты спосаб ужыў даследчы цэнтр «CASE Belarus», які праводзіў уласнае даследаванне з выкарыстаннем метадалогіі WEF (гл. Акулич, Валетко, Навродский, Сушкевич, 2015). Такія ацэнкі праводзіліся толькі для перыядаў 2012–2013 і 2013–2014 гадоў.

Іншы спосаб прадугледжвае ацэнку асобных складнікаў канкурэнтаздольнасці Беларусі на аснове аналізу проксі-паказчыкаў[3]. У якасці гэтых паказчыкаў могуць быць выкарыстаны розныя рэйтынгі: якасць інфраструктуры Сусветнага банка, рэйтынг лёгкасці вядзення бізнесу Doing Business, макраэканамічныя паказчыкі і г. д. Другі спосаб не прадугледжвае выкарыстання «чыстай» метадалогіі рэйтынгаў канкурэнтаздольнасці і разліку пазіцыі

[1] Гл. Праграма дзейнасці Урада РБ на 2011–2015 гады, 2011.

[2] Акрамя рэйтынгу глабальнай канкурэнтаздольнасці World Economic Forum, прадугледжвалася дасягненне як мінімум 70-га месца ў рэйтынгу эканамічнай свабоды фонда «Heritage», уваходжанне ў першыя 30 краін рэйтынгу Doing Business, а таксама ў першыя 50 краін па ўзроўні развіцця чалавечага патэнцыялу згодна з Дакладам пра развіццё чалавека Праграмы развіцця ААН.

[3] Тут і далей пад проксі-паказчыкамі мы будзем разумець тыя дадзеныя, аналіз якіх дазваляе здзейсніць ускосную ацэнку іншых паказчыкаў, разлік якіх з пэўных прычын з’яўляецца цяжкім.

Беларусі ў іх. Аднак ён дазваляе ацаніць асобныя складнікі краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі і даць рэкамендацыі па паляпшэнні паказчыкаў у іх.

Спецыфіка гэтага падыходу таксама дазваляе ацаніць складнікі канкурэнтаздольнасці без выкарыстання метадалогій, прымяненне якіх патрабуе значных рэсурсаў і выходзіць за межы дадзенай працы, і разгледзець *дынаміку* ключавых паказчыкаў за працяглы перыяд, што характарызуе краінавую канкурэнтаздольнасць[4]. У дадзенай працы намі будзе выкарыстаны менавіта другі метад, і па выніках аналізу будуць дадзеныя рэкамендацыі адносна магчымых напрамкаў дзейнасці ўладаў па павелічэнні краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі.

Праца структураваная наступным чынам. У першай частцы даецца агляд літаратуры па асноўных методыках ацэнкі краінавай канкурэнтаздольнасці. У агляд уключаныя не толькі методыкі, якія прадугледжваюць «рэйтынгаванне» краін (WEF і IMD), але і канцэпцыя Майкла Портэра, а таксама метад Арганізацыі Краін Эканамічнага Супрацоўніцтва (АЭСР). Гэты агляд неабходны для канцэптуалізацыі паняцця краінавай канкурэнтаздольнасці і абгрунтавання логікі, на аснове якой будуць абраныя згаданыя вышэй проксі-паказчыкі.

У другой частцы здзейснена канцэптуалізацыя і аперацыяналізацыя паняцця канкурэнтаздольнасці і абгрунтаванне выбару проксі-паказчыкаў, якія будуць выступаць у якасці сродкаў ацэнкі складнікаў краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі. У трэцяй частцы ажыццяўляецца аналіз дынамікі асноўных паказчыкаў канкурэнтаздольнасці (дакладней, выбраных намі проксі-паказчыкаў) і апісанне бягучых праблем ды выклікаў. Трэцяя частка ўключае ў сябе таксама агульнае параўнанне паказчыкаў Беларусі ў рэйтынгах, якія выкарыстоўваюцца як проксі-паказчыкі канкурэнтаздольнасці, у параўнанні з краінамі рэгіёну: краінамі ЦУЕ і СНД. У заключэнні пададзенае рэзюмэ працы і кароткія высновы аб прыярытэтнасці рэфармавання сфер для павышэння краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі.

[4] Там, дзе гэта магчыма, будзе праводзіцца аналіз дадзеных з 2000 года.

## Змест

**Уводзіны** ..... **1**

**1. Вызначэнні паняцця «канкурэнтаздольнасць» і спосабы яе вымярэння** ..... **4**

**1.1 Канцэпцыя Майкла Портэра** ..... 4

**1.2. Вымярэнне канкурэназдольнасці па методыцы Арганізацыі Эканамічнага Супрацоўніцтва і Развіцця (АЭСР)** ..... 5

**1.3. Падыход Сусветнага эканамічнага форуму** ..... 5

**1.4. Падыход IMD** ..... 6

**2. Канцэптуалізацыя паняцця канкурэнтаздольнасці і выбар паказчыкаў для яе ацэнкі** ..... **7**

**3. Ацэнка паказчыкаў канкурэнтаздольнасці Беларусі** ..... **10**

**3.1. Якасць кіравання і эфектыўнасць інстытутаў** ..... 10

**3.2. Інфраструктура** ..... 12

**3.3. Бізнес-асяроддзе** ..... 14

**3.4. Макраэканамічнае асяроддзе** ..... 17

**Высновы** ..... **20**

**Дадатак 1. Вызначэнне краінавай канкурэнтаздольнасці па версіі розных даследчыкаў і інстытуцый** ..... **22**

**Дадатак 2. Складнікі канкурэнтаздольнасці згодна з рэйтынгам WEF** ..... **24**

**Дадатак 3. Складнікі канкурэнтаздольнасці згодна з рэйтынгам IMD (апоры і фактары краінавай канкурэнтаздольнасці па метадалогіі IMD)** ..... 26

**Літаратура** ..... **27**

# 1. Вызначэнні паняцця «канкурэнтаздольнасць» і спосабы яе вымярэння

Паняцце канкурэнтаздольнасці мае шмат значэнняў, якія адрозніваюцца ў залежнасці ад дыскурсу, у якім яны ўжываюцца, і ў залежнасці ад інстытуцый або актараў, якія даюць трактоўку канкурэнтаздольнасці[5]. Найбольш часта паняцце канкурэнтаздольнасці выкарыстоўваюць у кантэксце канкурэнтаздольнасці фірмаў або тавараў; азначэнняў краінавай канкурэнтаздольнасці існуе менш. У гэтай працы мы разгледзім асноўныя падыходы да вызначэння і вымярэння краінавай канкурэнтаздольнасці. Такіх падыходаў чатыры:

1) Метадалогія аўтара канцэпцыі краінавай канкурэнтаздольнасці Майкла Портэра.

2) Метадалогія вымярэння канкурэнтаздольнасці АЭСР.

3) Падыход да вызначэння канкурэнтаздольнасці Сусветнага эканамічнага форуму (WEF).

4) Методыка вымярэння краінавай канкурэнтаздольнасці Міжнароднага інстытута кіраўнічага развіцця (IMD).

## 1.1 Канцэпцыя Майкла Портэра

Паводле заснавальніка канцэпцыі краінавай канкурэнтаздольнасці Майкла Портэра (Porter, 1998), канкурэнтаздольнасць краіны вызначаецца эфектыўнасцю, з якой яна выкарыстоўвае наяўныя рэсурсы, матэрыяльныя і нематэрыяльныя. Эфектыўнае выкарыстанне рэсурсаў дазваляе павялічыць прадукцыйнасць працы і, у канчатковым выніку, дасягнуць галоўнай мэты высокай канкурэнтаздольнасці: павелічэння дабрабыту насельніцтва за кошт забеспячэння эканамічнага росту.

У канцэпцыі Портэра эканамічны рост і стварэнне багацця адбываюцца на ўзроўні прадпрыемстваў; роля дзяржавы заключаецца ў фарміраванні рэгулятарнага асяроддзя, якое забяспечвае спрыяльныя ўмовы іх функцыянавання. Портэр вылучае чатыры цесна звязаныя паміж сабой фактары дасягнення канкурэнтаздольнасці, названыя ромбам канкурэнтаздольнасці:

1) развіццё інфраструктуры: інфармацыйнай, дарожнай, фінансавай, навуковай, а таксама якасць чалавечага капіталу;

2) інстытуцыйныя ўмовы: у першую чаргу, правілы, якія рэгулююць умовы вядзення бізнесу і ўплываюць на эканоміку;

3) асаблівасці ўнутранага попыту, што ўплываюць на набор тавараў, якія выпрацоўваюцца для спажывання ўнутры краіны, і на аб'ём інвестыцый;

4) наяўнасць у краіне галін, якія падтрымліваюць эканамічнае развіццё, што ўплывае на ўзнікненне вытворчых кластараў і вызначае спецыфіку краінавага экспарту.

Высокі ўзровень канкурэнтаздольнасці дасягаецца за кошт стварэння дзяржавай развітай інфраструктуры, прававога і інстытуцыйнага асяроддзя, якія дазваляюць прадпрыемствам максімальна эфектыўна выкарыстоўваць даступныя ім рэсурсы любога роду. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе ствараць тавары з высокай дададзенай вартасцю, нарошчваць тэхналагічны патэнцыял за кошт укаранення інавацый, а таксама прыцягваць інвестыцыі.

[5] Пашыраны спіс вызначэнняў паняцця краінавай канкурэнтаздольнасці гл. у Дадатку I.

## 1.2. Вымярэнне канкурэназдольнасці па методыцы Арганізацыі Эканамічнага Супрацоўніцтва і Развіцця (АЭСР)

У методыцы АЭСР нацыянальная канкурэнтаздольнасць разумеецца ў тэрмінах канкурэнтаздольнасці тавараў і паслуг канкрэтнай краіны ў параўнанні з таварамі іншых краін. Методыка АЭСР прадугледжвае разлік двух асноўных параметраў канкурэнтаздольнасці: імпарту і экспарту.

Разлік канкурэнтаздольнасці па методыцы АЭСР прадугледжвае вымярэнне адноснай прывабнасці тавараў канкрэтнай краіны на ўнутраным рынку і на рынку іншых краін. Канкурэнтаздольнасць краіны па імпарце вызначаецца коштавай прывабнасцю ўнутраных тавараў канкрэтнай краіны ў параўнанні з імпартаванымі. У сваю чаргу, канкурэнтаздольнасць краіны па экспарце разлічваецца як параўнанне экспартнай цаны на тавар з цаной тавараў іншых экспарцёраў на ўсіх рынках, на якіх прадстаўлены тавар канкрэтнай краіны.

Выніковы ўзровень канкурэнтаздольнасці па методыцы АЭСР вызначаецца як сярэднеўзважанае значэнне сумы канкурэнтаздольнасці тавараў па імпарце і экспарце (Durand, Giorno, 2004, pp. 155-157). Фармальна паняцце канкурэнтаздольнасці па методыцы АЭСР можна вызначыць як здольнасць канкрэтнай краіны ва ўмовах свабоднага гандлю[6] выраблять тавары, запатрабаваныя (у параўнанні з таварамі іншых краін) на ўнутраным і знешніх рынках.

Пры гэтым ацэнка канкурэнтаздольнасці па імпарце і экспарце не з'яўляецца самамэтай методыкі АЭСР: методыка разглядае ўзровень канкурэнтаздольнасці тавараў канкрэтнай краіны як свайго роду мета-проксі для ацэнкі яе патэнцыялу па ўкараненні тэхналагічных інавацый, узроўню спецыялізацыі вытворчасці, якасці тавараў і памеру ўдзельных выдаткаў на працу (Ibid, 2004, p. 149).

## 1.3. Падыход Сусветнага эканамічнага форуму

Паводле азначэння Сусветнага эканамічнага форуму, пад канкурэнтаздольнасцю краіны разумеецца яе здольнасць дасягаць устойлівага эканамічнага росту і забяспечваць рост занятасці насельніцтва. Гэтая здольнасць, у сваю чаргу, абумоўліваецца ступенню развіцця дванаццаці «апор» (*pillars*) канкурэнтаздольнасці (World Economic Forum, 2015b, pp. 4-9).

Хоць для павелічэння агульнага ўзроўню канкурэнтаздольнасці важна дасягненне поспеху ва ўсіх дванаццаці апорах канкурэнтаздольнасці, індэкс WEF робіць папраўку на ўзровень развіцця канкрэтнай краіны. Для краін, якія знаходзяцца на розных узроўнях развіцця, важнае дасягненне поспеху ў пэўных апорах канкурэнтаздольнасці. Індэкс канкурэнтаздольнасці WEF дзеліць усе краіны на тры тыпы ў залежнасці ад таго, якімі фактарамі дасягаецца развіццё іх эканомік[7].

Першая стадыя характарызуецца ростам за кошт таннасці рэсурсаў, якімі краіна валодае: у першую чаргу, мінеральных рэсурсаў і вялікага аб'ёму таннай працоўнай сілы. Другая стадыя характарызуецца ступенню развіцця эканомікі, пры якой краіна вычэрпвае запасы росту, даступныя за кошт танных рэсурсаў, у выніку чаго ёй неабходна рабіць акцэнт на павышэнні эфектыўнасці вытворчасці: аўтаматызацыі прадпрыемстваў, павышэнні якасці тавараў і адукацыі рабочай сілы. Пасля вычэрпвання запасаў росту, што забяспечвалі эфектыўнасць, краіне неабходны пераход на трэцюю, інавацыйную стадыю. Краіны, эканомікі якіх рухаюць інавацыі, павышаюць канкурэнтаздольнасць за кошт «вываду» на рынак унікальных інавацыйных тэхналогій, тавараў або паслуг.

---

[6] Пры падліку ўзроўню канкурэнтаздольнасці методыка АЭСР прадугледжвае адсутнасць гандлёвых бар'ераў.
[7] Апісанне «апор» канкурэнтаздольнасці і стадый развіцця эканомік згодна з метадалогіяй WEF гл. у Дадатку II.

### 1.4. Падыход IMD

Міжнародны Інстытут кіраўнічага развіцця дае два вызначэнні паняцця канкурэнтаздольнасці. У акадэмічным вызначэнні канкурэнтаздольнасць – гэта «галіна эканамічных ведаў, якая аналізуе палітыкі і меры, якія вызначаюць здольнасць нацыі ствараць і падтрымліваць асяроддзе, якое забяспечвае стварэнне большай даданай вартасці для прадпрыемстваў і большы ўзровень дабрабыту для насельніцтва» (IMD, 2015, p. 481). У спрошчаным вызначэнні канкурэнтаздольнасць разумеецца як «галіна аналізу, сфакусаваная на метадах, пры дапамозе якіх нацыі і прадпрыемствы забяспечваюць сукупнасць іх кампетэнцый для дасягнення дабрабыту або прыбытку» (IMD, 2015, p.488).

Дасягненне высокага ўзроўню гэтых кампетэнцый забяспечваецца поспехамі ў чатырох апорах канкурэнтаздольнасці, сярод якіх IMD вылучае эфектыўнасць урада, эфектыўнасць бізнесу, якасць інфраструктуры і стан эканамічнага асяроддзя. Кожная апора, у сваю чаргу, падзяляецца на некалькі фактараў. Дасягненне поспеху ў гэтых фактарах станоўча адбіваецца на прадукцыйнасці працы, што, у сваю чаргу, павялічвае канкурэнтаздольнасць краіны.

Тэарэтычная мадэль метадалогіі IMD прадугледжвае (гл. дыяграму ў Дадатку III), што ўрад, які працуе эфектыўна, забяспечвае паляпшэнне эканамічных паказчыкаў. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе павялічыць аб’ёмы інвестыцый у інфраструктуру. Інфраструктура, станоўчая макраэканамічная дынаміка і эфектыўны ўрад ствараюць пазітыўнае асяроддзе, якое дазваляе развівацца бізнесу. Сукупнасць гэтых фактараў гарантуе рост занятасці насельніцтва і прыбытковасць бізнесу ў доўгатэрміновай перспектыве, што, у выніку, забяспечвае ўстойлівы эканамічны рост[8].

Чатыры падыходы да вызначэння краінавай канкурэнтаздольнасці, акрэсленыя намі вышэй, апісваюць канкурэнтаздольнасць як сукупнасць некалькіх узаемазвязаных фактараў. Высокая канкурэнтаздольнасць забяспечваецца паляпшэннем паказчыкаў у гэтых фактарах. Методыка АЭСР факусуецца ў першую чаргу на ацэнцы паказчыкаў міжнароднага гандлю краіны, а методыкі IMD, WEF і канцэпцыя Портэра надаюць асноўную ўвагу такім паказчыкам як якасць інфраструктуры, якасць інстытутаў, макраэканамічная стабільнасць і стан бізнес-асяроддзя, то бок робяць акцэнт на ўнутраных структурных фактарах.

Агляд літаратуры дазволіў нам атрымаць уяўленне аб асноўных фактарах, якія ўплываюць на краінавую канкурэнтаздольнасць; грунтуючыся на гэтым, у наступным раздзеле мы канцэптуалізуем паняцце канкурэнтаздольнасці, якое дазволіць нам выкарыстоўваць для яго ацэнкі проксі-паказчыкі.

[8] У методыцы IMD гэта паняцце замяняецца паняццем «устойлівага стварэння прыбытку» (*long-term value creation*).

## 2. Канцэптуалізацыя паняцця канкурэнтаздольнасці і выбар паказчыкаў для яе ацэнкі

Апісаныя намі вышэй канцэпцыі краінавай канкурэнтаздольнасці па-рознаму падыходзяць да яе вызначэння. У гэтай частцы працы на падставе апісаных канцэпцый намі будзе дадзена канцэптуалізацыя і аперацыяналізацыя краінавай канкурэнтаздольнасці і абгрунтаваны выбар проксі-паказчыкаў для ацэнкі яе складнікаў.

Як ужо адзначалася ва ўводзінах, Беларусь не ўключана ў рэйтынгі канкурэнтаздольнасці WEF і IMD праз адсутнасць надзейных статыстычных дадзеных. Выніковы індэкс канкурэнтаздольнасці па метадалогіі WEF разлічваўся для Беларусі толькі аднойчы – у 1993 годзе ў сумесным даследаванні IMD і WEF. Уключэнне Беларусі ў індэкс канкурэнтаздольнасці WEF чакалася таксама ў 2012 годзе, чаго, аднак, не адбылося праз сумненні аўтараў справаздачы ў надзейнасці дадзеных, якія прадстаўляюцца афіцыйнай статыстыкай. З аналагічнай прычыны Беларусь і шэраг іншых краін не ўключаныя ў індэкс канкурэнтаздольнасці IMD. АЭСР не бярэ Беларусь у разлік проста таму, што краіна не з'яўляецца сябрам гэтай арганізацыі. У сваю чаргу, канцэпцыя Майкла Портэра не прадугледжвае рэйтынгавання краін па ўзроўні канкурэнтаздольнасці і не ўтрымлівае метадалогіі разлікаў рэйтынгу.

Разлік узроўню канкурэнтаздольнасці Беларусі па метадалогіі WEF здзяйсняўся даследчым цэнтрам «CASE Belarus» для 2012–2013 і 2013–2014 гадоў. У выніку разлікаў Беларусь была аднесена на 61-е месца ў індэксе канкурэнтаздольнасці (у выпадку, калі б была ўключана ў выніковы рэйтынг WEF; гл. Акулич, Валетко, Навродский, Сушкевич, 2015) і класіфікаваная як краіна, што рухаецца фактарам эфектыўнасці.

Акрамя таго, аналіз канкурэнтаздольнасці Беларусі праводзіўся даследчым цэнтрам ІПМ (ИПМ, 2010). Даследаванне ІПМ праводзілася па метадалогіі Майкла Портэра і факусавалася на такіх аспектах канкурэнтаздольнасці як канкурэнтаздольнасць знешняга гандлю, стан энергетычнага сектара краіны і развіццё бізнес-асяроддзя па стане на 2010 год.

У сваю чаргу, у дадзеным даследаванні мы засяродзімся на разглядзе *дынамікі* ключавых паказчыкаў, якія характарызуюць краінавую канкурэнтаздольнасць. *Грунтуючыся на логіцы канструявання рэйтынгаў канкурэнтаздольнасці, мы можам ўвесці ўласныя проксі-паказчыкі*[9] *ацэнкі канкурэнтаздольнасці Беларусі. Гэта дасць нам магчымасць ацаніць поспехі Беларусі ў канкрэтных аспектах, сукупнасць якіх фармуе канкурэнтаздольнасць, вызначыць, якія аспекты ў найбольшай ступені патрабуюць паляпшэння для павышэння краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі, і зрабіць гэта без ужывання працаёмкіх метадалогій рэйтынгаў канкурэнтаздольнасці, разлікі якіх выходзяць за межы дадзенай працы*.

У той час як метадалогія АЭСР засяроджваецца на паказчыках міжнароднага гандлю, WEF разглядае канкурэнтаздольнасць як стварэнне асяроддзя, якое забяспечвае эканамічны рост і занятасць, а IMD – як стварэнне асяроддзя, якое дазваляе назапашваць багацце і атрымліваць вялікі прыбытак для прадпрыемстваў.

Пры гэтым канцэпцыя Майкла Портэра ў вызначэнні канкурэнтаздольнасці шырэйшая за азначэнні канкурэнтаздольнасці, дадзеныя WEF, IMD ды АЭСР, і адначасова ўключае ў сябе іх асноўныя палажэнні. Такім чынам, у далейшым пад канкурэнтаздольнасцю будзем разумець вызначэнне Майкла Портэра: здольнасць краіны *эфектыўна выкарыстоўваць*

[9] Разлік рэйтынгу канкурэнтаздольнасці па метадалогіі WEF ці IMD надзвычай працаёмкі, патрабуе збору значнага аб'ёму дадзеных і выходзіць за межы дадзенай работы.

*наяўныя рэсурсы (чалавечыя і прыродныя, а таксама капітал) для стымулявання эканамічнага росту і павелічэння дабрабыту насельніцтва*[10].

Для вызначэння проксі-паказчыкаў, на падставе якіх мы будзем аналізаваць асобныя складнікі канкурэнтаздольнасці Беларусі, мы ацэнім складнікі канкурэнтаздольнасці, уключаныя ва ўсе апісаныя намі метадалогіі. Асаблівасцю рэйтынгаў WEF, IMD і канцэпцыі Портэра з'яўляецца тое, што апісаныя імі складнікі канкурэнтаздольнасці шмат у чым супадаюць (гл. Дадаткі II, III і апісанне канцэпцыі Портэра ў раздзеле 1.1). Як рэйтынгі, так і канцэпцыя Портэра прадугледжваюць, што рухавіком эканамічнага росту з'яўляюцца прадпрыемствы, якія функцыянуюць найбольш эфектыўна 1) у добрых інстытуцыйных умовах, 2) пры развітой інфраструктуры і 3) ва ўмовах, калі дзяржава здольная забяспечыць стабільнасць макраэканамічнага асяроддзя. Такім чынам, у далейшым у якасці проксі-паказчыкаў, якія выкарыстоўваюцца намі для ацэнкі поспехаў Беларусі ў сферы краінавай канкурэнтаздольнасці, мы будзем выкарыстоўваць:

1) Рэйтынгі IMD, WEF і канцэпцыя Портэра ў якасці складнікаў канкурэнтаздольнасці паказваюць якасць інстытуцыйнага асяроддзя дзяржавы. Пад інстытуцыйным асяроддзем мы разумеем заканадаўчыя ўмовы і працэдуры, а таксама практыкі іх прымянення, якія рэгулююць адносіны грамадзян, бізнесу і дзяржавы. Ацаніць гэтыя паказчыкі мы можам з выкарыстаннем рэйтынгу якасці інстытутаў World Governance Indicators (WGI). Абгрунтаваннем для гэтага з'яўляецца тое, што рэйтынг WGI[11] вымярае (гл. Kaufmann, Kraay, 2010) здольнасць дзяржавы распрацоўваць ды імплементаваць эфектыўныя палітыкі і забяспечваць высокую якасць дзяржаўных паслуг (паказчыкі «Якасць кіравання» і «Эфектыўнасць дзяржорганаў»). У гэты рэйтынг таксама ўключаецца ацэнка ўзроўню таго, у якой ступені адносіны паміж дзяржавай, бізнесам і грамадзянамі падпарадкоўваюцца заканадаўству, а не нефармальным практыкам (паказчыкі «Вяршэнства права» і «Кантроль карупцыі»). Акрамя таго, рэйтынг вымярае здольнасць грамадзян уплываць на рашэнні ўрада, а таксама ацэньвае ступень прысутнасці (або адсутнасці) палітычных канфліктаў (у тым ліку гвалту) у грамадстве (паказчыкі «Голас і падсправаздачнасць» і «Адсутнасць палітычнай нестабільнасці і гвалту»). Прымаючы пад увагу абранае намі вызначэнне канкурэнтаздольнасці, *высокая якасць інстытуцыйнага асяроддзя дазваляе эканамічным агентам ажыццяўляць сваю дзейнасць у празрыстай і зразумелай сістэме правіл, што не абмяжоўвае іх магчымасці і дазваляе эфектыўна ажыццяўляць эканамічную дзейнасць.*

2) Згодна з метадалогіямі WEF і IMD, а таксама канцэпцыяй Портэра, акрамя якасці інстытуцыйнага асяроддзя і эфектыўнасці ўрада, на канкурэнтаздольнасць уплывае бягучы стан эканомікі, які вызначаецца асноўнымі макраэканамічнымі паказчыкамі. Такім чынам, стан эканомікі як складнік канкурэнтаздольнасці мы будзем ацэньваць па наступных паказчыках: інфляцыя, тэмпы росту ВУП, прадукцыйнасць працы і памер даходаў. Хоць рост ВУП фактычна з'яўляецца вынікам эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў краіны (паколькі вымярае эканамічны рост), вельмі важна, якія менавіта рэсурсы выкарыстоўвае краіна для забеспячэння эканамічнага росту: гэта павінны быць унутраныя рэсурсы, а не знешняя рэнта або субсідаванне.

Стабільнасць эканомікі і яе бягучы стан, у сваю чаргу, *дазваляюць (ці не дазваляюць) эканамічным агентам весці сваю дзейнасць у прадказальным эканамічным асяроддзі, а таксама забяспечваюць ім абарону ад эканамічных страт і магчымасць для павелічэння прыбытку.*

---

[10] Пры гэтым эканамічны рост адбываецца за кошт павелічэння прадукцыйнасці працы. Рост прадукцыйнасці працы стае магчымым дзякуючы эфектыўнаму выкарыстанню наяўных рэсурсаў.

[11] Нягледзячы на значны аб'ём крытыкі на адрас метадалогіі World Governance Indicators (гл. Kaufman, Kraay, 2007), на дадзены момант гэты рэйтынг з'яўляецца найбольш распрацаваным і выкарыстаным рэйтынгам, што ацэньвае якасць і эфектыўнасць інстытутаў у розных краінах.

3) Акрамя таго, для росту эканомікі патрэбна развітая інфраструктура. Пад інфраструктурай мы разумеем базавыя фізічныя і арганізацыйныя структуры, неабходныя для функцыянавання бізнесу і грамадства. Пад гэтымі структурамі рэйтынгі IMD, WEF і Портэр разумеюць транспартную, тэлекамунікацыйную, фінансавую і банкаўскую інфраструктуры. Ацэнка гэтага складніка канкурэнтаздольнасці будзе здзейснена на аснове рэйтынгу лагістычнага патэнцыялу Сусветнага банка, што ацэньвае якасць дарожнай інфраструктуры, а таксама рэйтынгу развіцця інфраструктуры Kiel Institute for the World Economy, які ўключае ў сябе тэлекамунікацыйную, фінансавую і банкаўскую інфраструктуры. Развітая інфраструктура *надае эканамічным агентам магчымасць для найбольш хуткага і эфектыўнага функцыянавання і выкарыстання іх патэнцыялу*.

4) Згодна з метадалогіямі рэйтынгаў IMD, WEF і канцэпцыяй Портэра, эканамічны рост, у першую чаргу, забяспечваецца прадпрыемствамі, у той час як першачарговая задача дзяржавы – забяспечыць прымальнае асяроддзе для іх функцыянавання. Таму для ўзроўню канкурэнтаздольнасці вельмі важныя ўмовы працы бізнесу. Пад ўмовамі працы бізнесу мы разумеем адміністрацыйныя і заканадаўчыя ўмовы, якія тычацца канкрэтна работы прадпрыемстваў. Гэтыя ўмовы мы можам ацаніць за кошт аналізу паказчыкаў бізнес-асяроддзя: рэйтынгу лёгкасці вядзення бізнесу Doing Business, а таксама рэйтынгу ўспрымання карупцыі Transparency International. Гэты рэйтынг дазваляе дапоўніць ацэнку параметру «Кантроль карупцыі» рэйтынгу WGI, паколькі ацэньвае стаўленне грамадзян да здольнасці дзяржавы кантраляваць карупцыю, у той час як рэйтынг WGI ацэньвае канкрэтна намаганні дзяржавы ў гэтым кірунку. Лёгкасць вядзення бізнесу *вызначае здольнасць прадпрыемстваў эфектыўна ажыццяўляць сваю дзейнасць з найменшымі выдаткамі, звязанымі з дзейнасцю бізнесу як такога (выплатай падаткаў, адміністрацыйнымі працэдурамі і г. д.).*

Апісаныя вышэй проксі-паказчыкі дазваляюць ацаніць, наколькі ў канкрэтнай дзяржаве існуюць магчымасці для максімальна эфектыўнага выкарыстання прадпрыемствамі свайго патэнцыялу або, вяртаючыся да вызначэння канкурэнтаздольнасці Портэра (у якой прадпрыемствы з’яўляюцца галоўным драйверам эканамічнага росту), наколькі ў канкрэтнай краіне развітыя магчымасці для эфектыўнага функцыянавання прадпрыемстваў як асноўнага рэсурсу для росту эканомікі і назапашвання багацця.

У далейшым дынаміку асобных паказчыкаў канкурэнтаздольнасці Беларусі мы будзем параўноўваць з краінамі рэгіёну ЦУЕ і СНД. Там, дзе гэта магчыма, дынаміка дадзеных будзе апісана, пачынаючы з 2000 года. Высокія пазіцыі ў рэйтынгах мы будзем разглядаць як дасягненне поспеху ў канкрэтных фактарах канкурэнтаздольнасці.

## 3. Ацэнка паказчыкаў канкурэнтаздольнасці Беларусі

У папярэдняй частцы мы далі вызначэнне краінавай канкурэнтаздольнасці і вылучылі проксі-паказчыкі, на аснове якіх можа быць дадзена ацэнка складнікаў канкурэнтаздольнасці Беларусі. Як ужо паказвалася ў папярэдняй частцы, мы будзем разумець канкурэнтаздольнасць як здольнасць эфектыўна выкарыстоўваць рэсурсы для забеспячэння росту эканомікі і дабрабыту насельніцтва. Пры гэтым мы будзем меркаваць, што асноўная частка эканамічнага росту краіны ствараецца на ўзроўні прадпрыемстваў.

Ніжэй намі будзе праведзена ацэнка складнікаў канкурэнтаздольнасці для Беларусі на падставе выбраных намі проксі-паказчыкаў.

### 3.1. Якасць кіравання і эфектыўнасць інстытутаў

Як ужо адзначалася вышэй, якасць кіравання і эфектыўнасць інстытутаў моцна ўплываюць на канкурэнтаздольнасць краіны, паколькі складаюць «правілы гульні», у межах якіх функцыянуе эканоміка.

Графік 3.1. дэманструе дынаміку асноўных паказчыкаў якасці і эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання World Governance Indicators для Беларусі.

**Графік 3.1**. Дынаміка паказчыкаў World Governance Indicator для Беларусі. Паказчыкі разлічваюцца зыходзячы са становішча адносна іншых краін і вымяраюцца ад 0 («нізкае становішча») да 100 («высокае становішча»).




**Крыніца**: World Governance Indicators.

Як відаць з графіка, адносна добрыя вынікі Беларусь дэманструе толькі па паказчыку «Палітычная стабільнасць і адсутнасць гвалту», хоць гэты паказчык зніжаецца з 2003 года. Пры гэтым параметр нестабільны: на графіку бачныя цыклы ваганняў, звязаныя з электаральным календаром.

Беларусь дэманструе вельмі нязначныя поспехі ў астатніх параметрах эфектыўнасці кіравання і значна адстае ў гэтых адносінах ад іншых краін рэгіёну Цэнтральна-Усходняй Еўропы (гл. табліцу ніжэй).

**Табліца 3.2.** Дынаміка паказчыкаў якасці і эфектыўнасці дзяржаўнага кіравання. У ячэйках табліцы пазначаныя паказчыкі за 2013 год, у дужках – змяненні ў параўнанні з 2003 годам. Чырвоным колерам вылучаныя найгоршыя паказчыкі па слупку, зялёным – найлепшыя. Паказчыкі разлічваюцца зыходзячы са становішча іншых краін і вымяраюцца ад 0 («нізкае становішча») да 100 («высокае становішча»).

| **Краіна** | **Падсправа здачнасць і галоснасць** | **Палітычная стабільнасць і адсутнасць гвалту** | **Эфектыўнасць урада** | **Якасць кіравання** | **Вяршэнства права** | **Барацьба з карупцыяй** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Грузія | 55 (+15) | 31 (+19) | 69 (+34) | 74 (+49) | 54 (+36) | 67 (+35) |
| Малдова | 45 (+13) | 45 (+7) | 41 (+15) | 49 (+14) | 43 (+10) | 24 (+2) |
| Украіна | 37 (+7) | 21 (-9) | 30 (-3) | 29 (0) | 23 (0) | 12 (-7) |
| Кыргызстан | 30 (+9) | 19 (+2) | 29 (0) | 42 (+2) | 13 (-15) | 11 (-7) |
| Казахстан | 14 (-3) | 35 (-22) | 35 (+7) | 37 (+3) | 31 (+16) | 20 (+6) |
| Румынія | 57 (+1) | 53 (-3) | 53 (+6) | 69 (+18) | 56 (+11) | 53 (+6) |
| Латвія | 70 (0) | 65 (-17) | 76 (+3) | 80 (+2) | 73 (+7) | 64 (+4) |
| Літва | 75 (0) | 76 (-8) | 74 (-2) | 84 (+4) | 74 (+11) | 67 (+5) |
| Эстонія | 85 (+2) | 68 (-9) | 78 (-1) | 90 (+1) | 86 (+13) | 81 (+4) |
| Расія | 19 (-12) | 22 (+8) | 43 (+3) | 37 (-11) | 25 (+5) | 17 (-11) |
| Польшча | 78 (-1) | 79 (+16) | 71 (0) | 81 (+8) | 73 (+9) | 71 (+3) |
| Славакія | 76 (+1) | 89 (+9) | 73 (-1) | 78 (0) | 64 (+2) | 60 (-5) |
| Чэхія | 77 (0) | 84 (+9) | 75 (-3) | 82 (-3) | 82 (+6) | 63 (-8) |
| Венгрыя | 70 (-17) | 70 (-17) | 70 (-10) | 78 (-4) | 67 (-11) | 65 (-9) |
| Балгарыя | 58 (-5) | 55 (+6) | 59 (-2) | 68 (-2) | 51 (+5) | 50 (-5) |
| Славенія | 79 (-6) | 73 (-16) | 79 (-4) | 72 (-3) | 81 (0) | 74 (-6) |
| Харватыя | 63 (-2) | 66 (+3) | 71 (+4) | 66 (0) | 60 (+9) | 61 (+1) |
| Беларусь | 6 (-2) | 46 (-23) | 14 (+3) | 14 (+6) | 20 (+12) | 37 (+8) |

**Крыніца**: World Governance Indicators.

Пры дэталёвым разглядзе параўнальнай дынамікі параметраў інстытуцыйнай эфектыўнасці сярод краін Цэнтральна-Усходняй Еўропы, СНД і ЕАЭС Беларусь з'яўляецца відавочным аўтсайдарам па такіх параметрах як галоснасць і падсправаздачнасць, эфектыўнасць ўрада і якасць кіравання, саступаючы ў іх нават Кыргызстану. Па астатніх параметрах Беларусь, хоць і паказвае лепшыя паказчыкі, чым краіны-суседзі, такія як Расія і Украіна, у параўнальнай перспектыве ўсё роўна знаходзіцца ў канцы спісу.

Як ужо адзначалася вышэй, у тэорыі якасць інстытутаў мае фундаментальнае значэнне для эканамічнага росту, паколькі забяспечвае рэгуляторны асяродак функцыянавання бізнесу і эканамічных агентаў у цэлым, забяспечваючы тым самым паляпшэнне макраэканамічных паказчыкаў. Нізкая эфектыўнасць інстытутаў і якасці дзяржкіравання, а таксама высокі

ўзровень карупцыі ствараюць выдаткі для прадпрыемстваў, паколькі павялічваюць нявызначанасць прававога асяроддзя, у якім функцыянуе бізнес.

### 3.2. Інфраструктура

У галіне развіцця інфраструктуры Беларусь дэманструе супярэчлівыя паказчыкі, поспех краіны ў развіцці інфраструктуры таго ці іншага кшталту досыць моцна вар'іруецца.

Так, у адпаведнасці з глабальным індэксам развіцця інфраструктуры Kiel Institute for the World Economy (KIWE), Беларусь знаходзіцца на 39-м месцы ў па агульнай якасці развіцця інфраструктуры, суседнічаючы з такімі краінамі, як Малайзія, Саудаўская Аравія і Эстонія. Пры гэтым Беларусь атрымала досыць нізкія ацэнкі ва ўзроўні развіцця фінансавай інфраструктуры, што абумоўлена, у першую чаргу, неразвітасцю фондавага рынку (гл. табліцу ніжэй).

**Табліца 3.3.** Рэйтынг развіцця інфраструктуры (месца ў рэйтынгу). Зялёным пазначаныя найлепшыя паказчыкі па слупку, чырвоным – найгоршыя. У дужках у слупку «агульны рэйтынг» паказанае змяненне пазіцыі ў рэйтынгу з 2000 года.

| **Краіна** | **Агульны рэйтынг** | **Дарожная інфраструк-тура** | **Тэлекаму-нікацыі** | **Энергетыч-ная інфраструк-тура** | **Фінансавая інфраструк-тура** |
|---|---|---|---|---|---|
| Грузія | 112 (-24) | 74 | 84 | 66 | 130 |
| Малдова | 69 (N/A) | 70 | 57 | 107 | 59 |
| Украіна | 37 (+16) | 11 | 65 | 51 | 64 |
| Кыргызстан | 137 (N/A) | 98 | 139 | 111 | 98 |
| Казахстан | 73 (N/A) | 33 | 93 | 39 | 124 |
| Румынія | 86 (-14) | 108 | 59 | 59 | 106 |
| Латвія | 50 (-2) | 20 | 38 | 57 | 120 |
| Літва | 72 (-10) | 84 | 36 | 91 | 113 |
| Эстонія | 42 (-2) | 27 | 34 | 53 | 40 |
| Расія | 45 (-2) | 38 | 32 | 29 | 96 |
| Польшча | 44 (-2) | 29 | 43 | 45 | 66 |
| Славакія | 47 (-2) | 34 | 39 | 31 | 102 |
| Чэхія | 29 (N/A) | 16 | 30 | 25 | 68 |
| Венгрыя | 67 (-8) | 93 | 40 | 50 | 110 |
| Балгарыя | 48 (-2) | 46 | 33 | 40 | 82 |
| Славенія | 30 (0) | 19 | 20 | 26 | 88 |
| Харватыя | 34 (+7) | 42 | 28 | 52 | 25 |
| **Беларусь** | **39 (+2)** | **21** | **34** | **52** | **71** |

**Крыніца**: KIWE, 2014

Вельмі важным для Беларусі з’яўляецца развіццё транспартнай інфраструктуры і ўзровень развіцця лагістыкі. Беларусь займае выгаднае геаграфічнае становішча паміж буйнымі гандлёвымі партнёрамі: Расіяй, ЕС і Украінай, што дазваляе ёй выкарыстоўваць транзітны патэнцыял для эканамічнага развіцця ў цэлым. Акрамя таго, 2 з 9 найбуйнейшых транспартных калідораў Еўропы праходзяць праз Беларусь: гэта Масква–Берлін і Санкт-Пецярбург–Кіеў. Прывабнасць транзіту грузаў і пасажырскіх перавозак – як чыгуначных, так і аўтамабільных – павышаецца з прычыны кароткага транспартнага «пляча» і адсутнасці альтэрнатыўных маршрутаў з падобнай адлегласцю.

У той жа час, хоць Беларусь займае досыць высокае месца ў рэйтынгу развіцця дарожнай інфраструктуры KIWE, гэтыя перавагі нівеліруюцца праблемамі з фактарамі якасці лагістыкі. У індэксе лагістычнага патэнцыялу (Logistics Performance Index) Беларусь займае 99-е месца, суседнічаючы з такімі краінамі як Гана і Буркіна-Фасо.

**Табліца 3.4**. Агульны паказчык і складнікі Logistic Performance Index, 2014 год. У дужках у слупку ІЛП паказана месца краіны ў агульным рэйтынгу.

| **Краіна** | **ІЛП** | **Час** | **Трэкінг** | **Лагістычная кампетэнцыя** | **Міжнародныя дастаўкі** | **Інфраструктура** | **Мытня** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Грузія | 2.51 (116) | 3.09 | 2.59 | 2.44 | 2.32 | 2.42 | 2.21 |
| Малдова | 2.65 (94) | 2.89 | 2.35 | 2.44 | 3.14 | 2.55 | 2.46 |
| Украіна | 2.98 (61) | 3.51 | 3.20 | 2.84 | 2.95 | 2.65 | 2.69 |
| Кыргызстан | 2.21 (149) | 2.36 | 2.20 | 2.13 | 2.43 | 2.05 | 2.03 |
| Казахстан | 2.70 (88) | 3.24 | 2.83 | 2.72 | 2.68 | 2.38 | 2.33 |
| Румынія | 3.26 (40) | 4.0 | 3.39 | 3.20 | 3.32 | 2.77 | 2.83 |
| Латвія | 3.40 (36) | 4.06 | 3.50 | 3.21 | 3.38 | 3.03 | 3.22 |
| Літва | 3.18 (46) | 3.60 | 3.17 | 2.99 | 3.10 | 3.18 | 3.04 |
| Эстонія | 3.35 (39) | 3.55. | 3.20 | 3.27 | 3.34 | 3.34 | 3.40 |
| Расія | 2.69 (90) | 3.14 | 2.85 | 2.74 | 2.64 | 2.59 | 2.20 |
| Польшча | 3.49 (31) | 4.13 | 3.54 | 3.46 | 3.47 | 3.08 | 3.26 |
| Славакія | 3.25 (43) | 3.94 | 3.02 | 3.16 | 3.30 | 3.22 | 2.89 |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Чэхія | 3.49 (32) | 3.73 | 3.56 | 3.51 | 3.59 | 3.29 | 3.24 |
| Венгрыя | 3.46 (33) | 4.06 | 3.82 | 3.33 | 3.40 | 3.18 | 2.97 |
| Балгарыя | 3.16 | 4.04. | 2.88 | 3.00 | 3.31 | 2.94 | 2.75 |
| Славенія | 3.38 (38) | 3.82 | 3.51 | 3.51 | 3.05 | 3.35 | 3.11 |
| Харватыя | 3.05 (55) | 3.37 | 3.11 | 3.00 | 2.98 | 2.92 | 2.95 |
| **Беларусь** | **2.64 (99)** | **3.05** | **2.51** | **2.46** | **2.74** | **2.55** | **2.50** |

**Крыніца**: World Bank Logistics Performance Index.

У рэйтынгу індэкса лагістычнага патэнцыялу агульны вынік Беларусі сярод разгляданых краін па агульным індэксе вышэйшы толькі за індэкс Кыргызстана. Пры разглядзе фактараў, якія ўваходзяць у індэкс лагістычнага патэнцыялу, відаць: найлепшы вынік Беларусь паказвае ў фактары «хуткасць», што адпавядае высновам рэйтынгу KIWE. Хоць Беларусь займае высокае месца па развіцці дарожнай інфраструктуры, агульны патэнцыял транспартна-лагічнай сеткі Беларусі зніжаецца за кошт няякаснай інфраструктуры абслугоўвання перавозак.

Праз Беларусь, у першую чаргу, праходзяць досыць буйныя энергетычныя лініі: нафтаправод «Дружба» і газавая лінія «Ямал–Еўропа».

Патэнцыял развіцця транзіту энергарэсурсаў трубаправодным транспартам праз Беларусь абмежаваны: фактычна, аб’ём транзіту вызначаецца экспартнай стратэгіяй «Газпрама» і расійскіх экспарцёраў нафты. Важнасць беларускага напрамку транзіту энергарэсурсаў істотна знізілася пасля ўзяцця расійскімі ўладамі курсу на дыверсіфікацыю напрамкаў паставак энерганосьбітаў (у першую чаргу, за кошт будаўніцтва абыходных шляхоў: нафтаправода БТС-2 і газаправода «Паўночны паток»). Таму мы можам лічыць, што ў гэтай галіне Беларусь цалкам выкарыстоўвае існуючыя магчымасці.

Высокае месца Беларусі ў рэйтынгу развіцця тэлекамунікацый абумоўлена, у першую чаргу, высокім узроўнем выкарыстання інтэрнэту і вялікай колькасцю тэлефонных сетак насельніцтва: у 2014 годзе 57,1% насельніцтва краіны карысталіся інтэрнэтам, з іх 60% – на штодзённай аснове (BelTa, 2014).

Аднак у галіне развіцця фінансавых інстытутаў рэйтынг KIWE вызначыў Беларусь толькі на 71-м месцы. Прычына гэтага – агульная неразвітасць фінансавых рынкаў (асабліва фондавага), абумоўленая, у першую чаргу, адсутнасцю яснага заканадаўства, што тычыцца фінансавых інстытутаў, і практыкі яго прымянення.

## 3.3. Бізнес-асяроддзе

У 2015 годзе Беларусь заняла 44-е месца ў рэйтынгу Doing Business, апусціўшыся на адну пазіцыю з 2014 года. У 2014 годзе метадалогія падліку рэйтынгу лёгкасці вядзення бізнесу была змененая, пасля чаго дадзеныя сталі падлічвацца па іншай працэдуры, што не дазваляе цалкам карэктна ацаніць дынаміку Беларусі ў гэтай галіне з 2000 года. Аднак магчыма ацаніць дынаміку Беларусі па паказчыку «Distance from frontier», які паказвае адноснае становішча эканомікі па лёгкасці вядзення бізнесу ў параўнанні з краінай, якая дэманструе ў гэтай галіне найлепшы вынік (гл. Дыяграму 3.1.). Хоць метадалогія разліку

пазіцый краін у рэйтынгу была зменeная ў 2014 годзе, асаблівасці падліку паказчыка «Distance from frontier» дазваляюць адсачыць дынаміку гэтага паказчыка з 2010 года.

**Дыяграма 3.1.** Дынаміка паказчыка «Distance from frontier» рэйтынгу Doing Business ў 2015 годзе. Вось Y – паказчык у 2015 годзе, вось X – дынаміка з 2004 года. Чым вышэйшае значэнне па восі Y, тым лепшы паказчык дэманструе краіна ў галіне лёгкасці вядзення бізнесу. Лічбамі пазначаныя краіны: 1 – Славакія, 2 – Балгарыя, 3 – Латвія, 4 – Румынія, 5 – Славенія, 6 – Казахстан.




**Крыніца**: Doing Business.

Як відаць з графіку, Беларусь дэманструе адносна нядрэнныя вынікі ў параўнанні з іншымі краінамі рэгіёну ва ўзроўні лёгкасці вядзення бізнесу. Адначасова з гэтым, Беларусь займае другое месца па хуткасці ўкаранення паляпшэнняў у гэтай галіне.

**Табліца 3.5**. Паказчыкі рэйтынгу Doing Business для Беларусі, 2015 год

| **Параметр Doing Business** | **Агульнае становішча** |
|---|---|
| Рэгістрацыя прадпрыемстваў | 12 |
| Атрыманне дазволу на будаўніцтва | 34 |
| Падключэнне да электрасеткі | 89 |
| Рэгістрацыя ўласнасці | 7 |
| Атрыманне крэдытаў | 109 |
| Абарона мінарытарных інвестараў | 57 |
| Падаткаабкладанне | 63 |
| Міжнародны гандаль | 125 |
| Забеспячэнне выканання кантрактаў | 29 |
| Працэдура банкруцтва | 69 |

**Крыніца**: Doing Business.

Хоць пасля змянення метадалогіі параўнанне пазіцый па гадах (да і пасля змянення) у рэйтынгу Doing Business не зусім карэктнае, умоўна праілюстраваць поспех Беларусі ў палягчэнні ўмоў вядзення бізнесу можна за кошт параўнання паказчыкаў 2015 і 2009 гадоў: у 2009 годзе Беларусь знаходзілася на 85-м месцы ў рэйтынгу.

З 2008 года ў заканадаўства Беларусі быў унесены шэраг зьяненняў, і значна спрасцілася вядзенне бізнесу ў краіне. У першую чаргу, было спрошчана падатковае заканадаўства (за кошт ліквідацыі шэрагу ўскосных падаткаў), прынятыя меры па паскарэнні працэдуры выплаты падаткаў, а таксама ўнесеныя змены ў заканадаўства аб рэгістрацыі ўласнасці, што сур'ёзна паскорыла працэдуры рэгістрацыі. Акрамя таго, былі значна спрошчаныя працэдуры, спадарожныя працэсу міжнароднага гандлю, а таксама была зніжана агульная колькасць такіх працэдур. Беларусь таксама распачала крокі па ліквідацыі адміністрацыйных бар'ераў, звязаных з працэдурамі ў галінах стандартызацыі, рэгістрацыі, сертыфікацыі і ліцэнзавання. Аднак нягледзячы на ўсе паляпшэнні, паводле рэйтынгу Doing Business, з найбольшымі цяжкасцямі бізнес у Беларусі па-ранейшаму сутыкаецца ў такіх галінах як падлучэнне да электрасеткі, атрыманне крэдытаў, абарона правоў мінарытарных інвестараў і міжнародны гандаль.

У той жа час, існуюць фактары, якія не ацэньваюцца ў рэйтынгу Doing Business, але ўплываюць на характарыстыкі бізнес-асяроддзя ў Беларусі – у першую чаргу, гэта ўзровень карупцыі.

У раздзеле 3.1. мы ўжо звярталі ўвагу на параметр «Барацьба з карупцыяй» у рэйтынгу WGI. Аднак для ацэнкі ўмоў функцыянавання менавіта бізнес-асяроддзя важна ацаніць таксама вынікі Беларусі ў рэйтынгу ўспрымання карупцыі Transparency International. У той час як паказчык барацьбы з карупцыяй World Governance Indicators ацэньвае *намаганні* дзяржавы па зніжэнні ўзроўню карупцыі, рэйтынг Transparency International ацэньвае адчуваны ўзровень карупцыі ў краіне. У 2015 годзе Беларусь заняла ў ім 129-е месца, значна адстаўшы ад іншых краін рэгіёну.

**Табліца 3.6.** Дынаміка месцаў у рэйтынгу ўспрымання карупцыі, 2003–2014 гады. Зялёным колерам пазначаныя найгоршыя вынікі, чырвоным – найлепшыя.

| | **2003** | **2005** | **2013** |
|---|---|---|---|
| **Грузія** | 124 | 130 | 50 |
| **Малдова** | 100 | 88 | 103 |
| **Украіна** | 106 | 107 | 142 |
| **Кыргызстан** | 118 | 130 | 136 |
| **Казахстан** | 100 | 107 | 126 |
| **Румынія** | 83 | 85 | 69 |
| **Латвія** | 57 | 51 | 43 |
| **Літва** | 41 | 44 | 39 |
| **Эстонія** | 33 | 27 | 56 |
| **Расія** | 86 | 126 | 136 |
| **Польшча** | 64 | 70 | 35 |
| **Славакія** | 59 | 47 | 54 |
| **Чэхія** | 54 | 47 | 53 |
| **Венгрыя** | 40 | 40 | 47 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Балгарыя** | 54 | 55 | 43 |
| **Славенія** | 59 | 31 | 39 |
| **Харватыя** | 59 | 70 | 61 |
| **Беларусь** | 53 | 107 | 119 |

**Крыніца:** Transparency International.

Пра карупцыю як сур'ёзную праблему, што перашкаджае ажыццяўленню прадпрымальніцкай дзейнасці, кажуць самі бізнесмены, асабліва прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу. Даследаванне, праведзенае цэнтрам ІПМ, дэманструе (гл. Скриба, Урютина, 2015), што больш за палову апытаных прадстаўнікоў сярэдніх і малых прадпрыемстваў кажуць пра паўсюднае распаўсюджванне карупцыі альбо пра «распаўсюд вышэй за сярэдняе». Карупцыя асабліва распаўсюджаная ў дзейнасці кантралюючых органаў, а таксама пры атрыманні ліцэнзій і дазволаў. Пры гэтым крыху менш за палову апытаных бізнесоўцаў кажуць, што дзейнасць дзяржавы па барацьбе з карупцыяй не прыносіць вынікаў альбо прыносіць вельмі абмежаваныя вынікі.

У цэлым, высокія пазіцыі Беларусі па многіх параметрах рэйтынгу Doing Business сведчаць аб паляпшэнні заканадаўства, якое рэгулюе бізнес-асяроддзе. Аднак высокі ўзровень карупцыі і нізкая якасць інстытутаў (па рэйтынгу WGI) кажуць пра існаванне праблем з правапрымяненнем і нізкай якасцю рэгулятарнага асяроддзя, у якім функцыянуе бізнес. З улікам існавання спрыяльнага заканадаўства, бізнес мог бы стаць драйверам росту канкурэнтаздольнасці краіны, аднак для гэтага неабходнае ўкараненне цэлага шэрагу інстытуцыйных рэформаў. Аб неабходнасці такіх рэформаў кажуць і самі бізнесоўцы: па іх ацэнках, рост бізнесу ў Беларусі падштурхнуць тэрміновыя рэформы, у першую чаргу інстытуцыйная рэформа, рэформа дзяржпрадпрыемстваў і лібералізацыя рынку працы (Урютина, 2015).

### 3.4. Макраэканамічнае асяроддзе

У перыяд з 2000 па 2010 гады эканоміка Беларусі расла хуткімі тэмпамі: сярэднегадавы прырост ВУП склаў 7,2% з улікам падзення да 0% у крызісны 2009 год. У сваю чаргу, ВУП на душу насельніцтва ў перыяд з 2000 па 2014 гады вырас у 12,7 разоў з 1474 да 18777 даляраў (гл. графік ніжэй).

**Графік 3.2.** Дынаміка ўзроўню ВУП (% да папярэдняга года, левая вось Y) і ВУП на душу насельніцтва (даляраў, правая вось Y), 2000–2014 гады.




**Крыніца**: МВФ, Сусветны банк.

Як відаць з дыяграмы 3.2, у перыяд з 2000 па 2014 год Беларусь была ў ліку лідараў па сярэднегадавым тэмпе росту ВУП і ВУП на душу насельніцтва, апераджаючы такія краіны як Польшча і Венгрыя.

**Дыяграма 3.2.** Сярэднегадавыя тэмпы росту ВУП і ВУП на душу насельніцтва, 2000–2014 гады. Вось X – сярэднегадавыя тэмпы росту ВУП у %, вось Y – сярэднегадавыя тэмпы росту ВУП на душу насельніцтва ў %.




**Крыніца**: Сусветны банк.

Адначасова з гэтым, сярэдняя заработная плата ў даляравым вылічэнні вырасла з 73 да 590 даляраў. Зніжэнне памераў сярэдняй заработнай платы ў даляравым эквіваленце адбываліся толькі ў 2009 і 2012 гадах пасля дэвальвацый беларускага рубля.

**Графік 3.3.** Сярэдняя заработная плата ў Беларусі (у далярах), 2000–2014 гады




**Крыніца**: ІПМ.

Аднак эканамічны рост у Беларусі за гэты перыяд у значнай ступені быў забяспечаны не ростам прадукцыйнасці працы, але атрыманнем субсідый па пастаўках расійскай нафты і газу, павелічэннем аб'ёмаў знешніх запазычанняў, а таксама атрыманнем прыярытэтнага доступу на расійскія рынкі для беларускіх тавараў. Аб'ём расійскіх нафтагазавых субсідый, па падліках Сусветнага банка (Всемирный банк, 2012), у розныя гады складаў ад 7% да 25% ВУП. Адначасова з гэтым, субсідыі, якія фактычна заключаюцца ў зніжэнні цаны на нафту і газ у параўнанні з сярэднееўрапейскай цаной, стварылі вельмі спрыяльныя ўмовы для працы

беларускіх нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў (гэтаму таксама паспрыяў рост цаны на нафту), а таксама дазволілі знізіць выдаткі дзяржаўных прадпрыемстваў на аплату энерганосьбітаў.

Пры гэтым рост даходаў насельніцтва фактычна не быў абумоўлены ростам эканомікі. Рост заработнай платы на працягу разгляданага перыяду часцяком перавышаў рост прадукцыйнасці працы (гл. графік ніжэй).

**Графік 3.4.** Дынаміка тэмпаў росту заработнай платы і прадукцыйнасці працы ў Беларусі, 1996–2011 гады. Сіняя крывая – прадукцыйнасць, чорная – заработная плата. Зялёныя слупкі дэманструюць разыходжанне.




**Крыніца**: Чубрик, Шиманович, 2011.

Паказаныя на графіку разыходжанні ў дынаміцы росту заработнай платы і прадукцыйнасці працы тлумачацца наяўнасцю цыклічнай кампаненты, прывязанай да электаральных падзей. Рост заработнай платы пры гэтым паўплываў на дыспрапорцыю гандлёвага балансу, значна павялічыўшы аб’ём імпарту і знізіўшы прывабнасць беларускіх тавараў на ўнутраным рынку.

Узровень інфляцыі ў Беларусі на працягу толькі трох гадоў – 2006, 2007 і 2010 гадоў – захоўваўся на ўзроўні ніжэйшым за двухзначнае значэнне. Зніжэнне інфляцыі з ўзроўню ў 169% у 2000 годзе тлумачыцца намаганнямі па макраэканамічнай стабілізацыі, якія прадпрымаюцца Нацыянальным банкам на працягу доўгага часу. У сваю чаргу, у 2010 годзе зніжэнне ўзроўню інфляцыі адбылося праз запаволенне глабальнай эканомікі пасля эканамічнага крызісу 2009 года. У 2011 і 2012 гадах адбыўся скачок інфляцыі – у першую чаргу з прычыны павышэння цаны на нафту і газ, што пастаўляюцца з Расіі.

**Графік 3.5**. Інфляцыя ў Беларусі,% да папярэдняга года, 2000–2014 гады




**Крыніца:** Сусветны банк.

## Высновы

У дадзенай працы быў прадстаўлены агляд існуючых методык ацэнкі краінавай канкурэнтаздольнасці, а таксама быў праведзены кароткі аналіз асноўных параметраў, якія вызначаюць канкурэнтаздольнасць Беларусі.

Намі былі апісаныя метадалогіі вызначэння краінавай канкурэнтаздольнасці WEF, IMD, АЭСР і канцэпцыя Портэра. З улікам таго, што Беларусь не ўключана ў рэйтынгі WEF і IMD праз адсутнасць надзейных дадзеных, такое апісанне было неабходнае для разумення логікі пабудовы паняцця канкурэнтаздольнасці. Каб акрэсліць паняцце канкурэнтаздольнасці, мы абралі вызначэнне з канцэпцыі Майкла Портэра: здольнасць краіны выкарыстоўваць унутраныя рэсурсы для паскарэння эканамічнага росту і павелічэння дабрабыту насельніцтва. Паколькі падыходы IMD, WEF і канцэпцыя Портэра вызначаюць бізнес як галоўны драйвер эканамічнага росту, у далейшым у працы бізнес як галоўны рэсурс, неабходны для дасягнення высокага ўзроўню канкурэнтаздольнасці.

З улікам асаблівасцяў рэйтынгаў IMD і WEF, а таксама метадалогіі Майкла Портэра, мы вылучылі агульныя для гэтых метадалогій складнікі канкурэнтаздольнасці і вызначылі паказчыкі, на падставе якіх можа быць дадзена іх ацэнка. Праведзены намі аналіз дынамікі паказчыкаў дэманструе, што па складніках канкурэнтаздольнасці Беларусь паказвае значна меншы поспех, чым краіны рэгіёну.

Высокія вынікі Беларусь дэманструе толькі ў паказчыках заканадаўчых умоў вядзення бізнесу і некаторых макраэканамічных паказчыках (у першую чаргу, тэмпах росту ВУП). Аднак гэтыя поспехі нівеліруюцца негатыўным уплывам іншых фактараў (у выпадку бізнесу – моцным уплывам карупцыі) і не сведчаць пра эфектыўную работу ўрада (як у выпадку ВУП, хуткі рост якога шмат у чым абумоўлены расійскім субсідаваннем). Рост краінавай канкурэнтаздольнасці Беларусі патрабуе паляпшэння цэлага шэрагу паказчыкаў, якія ўплываюць на працаздольнасць прадпрыемстваў.

Згодна з Портэрам, рост краінавай канкурэнтаздольнасці магчымы пры росце эфектыўнасці выкарыстання рэсурсаў; гэты рост, у сваю чаргу, павышае прадукцыйнасць працы. З гэтай прычыны для дасягнення высокай канкурэнтаздольнасці Беларусі неабходнае ўкараненне шэрагу рэформ, якія б павысілі эфектыўнасць працы прадпрыемстваў.

Мы мяркуем, што гэтыя рэформы, у першую чаргу, павінны тычыцца прыватных прадпрыемстваў і мусяць быць накіраваныя на павелічэнне ўкладу прыватнага сектара ў ВУП. Як ужо паказвалася вышэй, хуткі рост беларускай эканомікі, які назіраўся ў 2000–2010 гадах, у значнай ступені быў стымуляваны расійскімі субсідыямі, а не высокай прадукцыйнасцю працы на прадпрыемствах. Хоць эканамічны рост з'яўляецца выніковай мэтай высокай краінавай канкурэнтаздольнасці, у выпадку з Беларуссю ён быў дасягнуты за кошт выкарыстання знешняй дапамогі: ільготных умоў паставак энерганосьбітаў і прыярытэтнага доступу на расійскі рынак. Для забеспячэння «канкурэнтаздольнага» эканамічнага росту Беларусі, такім чынам, неабходныя рэформы, якія дадуць магчымасць бізнесу ў большай меры выкарыстаць свой патэнцыял

Бягучая сістэма дзяржкіравання ў Беларусі сур'ёзна абмяжоўвае патэнцыял бізнесу. У гэтым кірунку неабходна павышэнне якасці дзяржкіравання, празрыстасці заканадаўства і эфектыўнасці ўрада, а таксама барацьба з карупцыяй: гэта дазволіць бізнесу працаваць у больш прадказальных адміністратыўных і прававых умовах.

У галіне інфраструктуры Беларусі неабходна дадатковае развіццё і паляпшэнне якасці лагістыкі для больш эфектыўнага выкарыстання транзітнага патэнцыялу як драйвера эканамічнага развіцця.

У цэлым для павышэння канкурэнтаздольнасці Беларусі неабходна зніжэнне адміністрацыйных бар'ераў у галіне рэгулявання бізнесу, а таксама лібералізацыя і

рэфармаванне рынку працы для павышэння стымулаў работнікаў да павелічэння прадукцыйнасці.

У галіне макраэканамічнай палітыкі і гандлю Беларусі неабходны пераход ад палітыкі макраэканамічнага папулізму да правядзення структурных рэформаў. Гэта дасць магчымасць стымуляваць рост краінавай канкурэнтаздольнасці за кошт стварэння стабільнага макраэканамічнага асяроддзя, якое дазваляе бізнесу дзейнічаць ва ўмовах большай эканамічнай упэўненасці.

## Дадатак 1. Вызначэнне краінавай канкурэнтаздольнасці па версіі розных даследчыкаў і інстытуцый

| **Вызначэнне** | **Аўтар / Крыніца** |
|---|---|
| Здольнасць падтрымліваць патэнцыял кампаній, індустрыі, рэгіёнаў да стварэння фактараў, якія вядуць да павышэння ўзроўню заробку і занятасці. | OECD, 1997. |
| Здольнасць краіны вырабляць тавары і паслугі, якія праходзяць тэст міжнародных рынкаў, у доўгатэрміновай перспектыве ажыццяўляць устойлівае павышэнне ўзроўню жыцця грамадзян. | The First Report to the President and Congress, 1992. US Competitiveness Policy Council. |
| Здольнасць індустрый або кампаній пераадольваць цяжкасці, якія накладаюцца на іх кампаніямі-канкурэнтамі. | US Department of Energy. |
| Канкурэнтаздольнасць уключае ў сябе прадукцыйнасць, эфектыўнасць і прыбытковасць – але не абмяжоўваецца імі. Дасягненне складнікаў канкурэнтаздольнасці не з’яўляецца самамэтай. Імкненне да дасягнення гэтых складнікаў – магутны сродак для павышэння ўзроўню жыцця і сацыяльнага забеспячэння грамадзян. У цэлым, за кошт павелічэння эфектыўнасці і прадукцыйнасці канкурэнтаздольнасць дазваляе забяспечыць устойлівы рост даходаў грамадзян. | Competitiveness Advisory Group, (Ciampi Group). “Enhancing European Competitiveness”. First report to the President of the Commission, the Prime Ministers and the Heads of State, June 1995. |
| Канкурэнтаздольнасць уключае ў сябе эфектыўнасць (дасягненне мэтаў з мінімальнымі выдаткамі) і прадуктыўнасць (дасягненне правільных мэтаў). | Buckley, P. J. et al, “Measures of International Competitiveness: A critical Survey”, Journal of Marketing Management, 1988. |
| Краінавая канкурэнтаздольнасць вызначае здольнасць канкрэтнай краіны ствараць, вырабляць, размяркоўваць і / або абслугоўваць тавары для міжнароднага гандлю, у той час як прыбытковасць гандлю гэтымі таварамі пастаянна расце. | Scott, B. R. and Lodge, G. C., “US Competitiveness in the World Economy”, 1985, pg. 3. |

| | |
|---|---|
| Бягучая і будучая здольнасць (і наяўнасць магчымасцяў) прадпрыемстваў выпрацоўваць тавары, чые цэнавыя і няцэнавыя якасці ў сукупнасці з'яўляюцца больш прывабнымі для замежных пакупнікоў, чым тавары канкурэнтаў. | European Management Produce and Market |

**Дадатак 2. Складнікі канкурэнтаздольнасці згодна з рэйтынгам WEF**

| **Фактары росту эканомікі** | **Складнікі фактараў росту** | **Тып эканомікі** |
|---|---|---|
| **Базавыя фактары** | Інстытуты. Інстытуцыйнае асяроддзе вызначаецца заканадаўствам краіны, якое структуруе адносіны эканамічных агентаў, бізнесу і дзяржавы ў галіне стварэння матэрыяльнага дабрабыту. | Эканоміка, якую рухаюць фактары вытворчасці |
| | Інфраструктура. Развітая і эфектыўная інфраструктура крытычна важная для забеспячэння ўстойлівага росту эканомікі. Яна вызначае месцазнаходжанне эканамічных цэнтраў і тып сектараў, якія могуць развівацца ўнутры краіны, спрыяе інтэграцыі нацыянальнай эканомікі ў рэгіянальную і зніжае транспартныя ды лагістычныя выдаткі. | |
| | Макраэканамічнае асяроддзе. Макраэканамічнае асяроддзе вызначае паспяховасць вядзення бізнесу ўнутры краіны, а таксама вызначае здольнасць дзяржавы забяспечваць устойлівы эканамічны рост у цэлым. | |
| | Ахова здароўя і базавая адукацыя. Прадукцыйнасць працы залежыць ад якасці аховы здароўя: грамадзяне, якія хварэюць, не могуць быць задзейнічаныя ў вытворчасці, што зніжае ўзровень прадукцыйнасці. Якасць агульнай адукацыі павышае эфектыўнасць работніка як у плане яго навыкаў, так і ў здольнасці да навучання. | |
| **Фактары эфектыў-насці** | Вышэйшая адукацыя. Якасць вышэйшай адукацыі важная для эканомік, накіраваных на пераход да вытворчасці высокатэхналагічных і інавацыйных прадуктаў, а таксама для эфектыўнасці эканомікі ў цэлым. | Эканоміка, якую рухае эфектыўнасць вытворчасці |
| | Эфектыўны рынак. Краіны з эфектыўным рынкам найлепшым чынам прыстасоўваюцца да кан'юнктуры рынкаў і вырабляюць правільны "набор" тавараў і паслуг, якія эфектыўна прадаюцца ўнутры і за межамі нацыянальнай эканомікі. | |
| | Эфектыўны рынак працы. Высокая эфектыўнасць і гнуткасць рынку працы дазваляе работнікам канцэнтравацца ў тых сектарах эканомікі, у якіх іх набор навыкаў і ўменняў прыносіць найбольшую карысць, што павышае іх матывацыю да ўкладання максімуму намаганняў у вытворчасць. Гнуткі рынак працы дазваляе работнікам з мінімальнымі выдаткамі мяняць сферу дзейнасці без значных ваганняў ва ўзроўні іх заработнай платы. | |

| | | |
|---|---|---|
| | Фінансавыя інстытуты. Развіты фінансавы рынак дазваляе алацыраваць назапашанае грамадзянамі краіны і знешнімі інвестарамі багацце і накіроўваць яго ў тыя сектары эканомікі і кампаніі, якія паказваюць найвышэйшы ўзровень эфектыўнасці. | |
| | Тэхналагічная кампетэнтнасць. Тэхналагічная кампетэнтнасць павышае здольнасць да эфектыўнага ўкаранення новых тэхналогій і практык у вытворчасць і працоўныя працэсы, што вядзе да росту прадукцыйнасці працы і эфектыўнасці вытворчасці. | |
| | Памер рынку збыту. Памер рынку дазваляе павялічваць прадукцыйнасць за кошт задзейнічання эфекту маштабу ў выпадку, калі рынак вялікі. Рынак збыту ў гэтым выпадку не абмяжоўваецца выключна ўнутраным рынкам краіны: росту канкурэнтаздольнасці краіны спрыяе адсутнасць гандлёвых бар’ераў. | |
| **Фактары інавацый** | Якасць бізнес-практык. Якасць бізнес-практык уплывае на якасць рынкавых стратэгій індывідуальных фірмаў. Гэта павялічвае прадуктыўнасць эканомікі за кошт укаранення інавацый і аптымізацыі бізнес-працэсаў, а таксама прыводзіць да эфектаў запазычання найбольш эфектыўных практык іншымі фірмамі. | Эканоміка інавацый |
| | Інавацыі і тэхналогіі. Укараненне інавацый крытычна неабходнае для павышэння эфектыўнасці і прадукцыйнасці эканомікі, вельмі важнае для павышэння канкурэнтаздольнасці тавараў і пераходу да вытворчасці тавараў з больш высокай дададанай вартасцю. | |

**Дадатак 3. Складнікі канкурэнтаздольнасці згодна з рэйтынгам IMD (апоры і фактары краінавай канкурэнтаздольнасці па метадалогіі IMD)**

| **Апора** | **Фактары** |
|---|---|
| Эканамічнае асяроддзе | Унутраная эканоміка |
| | Знешні гандаль |
| | Замежныя інвестыцыі |
| | Узровень занятасці |
| | Узровень цэнаў |
| Эфектыўнасць урада | Дзяржаўныя фінансы |
| | Фіскальная палітыка |
| | Інстытуцыйны дызайн |
| | Бізнес-заканадаўства |
| | Сацыетальнае асяроддзе |
| Эфектыўнасць бізнесу | Прадукцыйнасць |
| | Рынак працы |
| | Фінансы |
| | Бізнес-практыкі |
| | Узаемаадносіны і каштоўнасці |
| Інфраструктура | Базавая інфраструктура |
| | Тэхналагічная інфраструктура |
| | Навуковая інфраструктура |
| | Здароўе і навакольнае асяроддзе |
| | Адукацыя |

**Крыніца**: IMD, 2015, p.481.

## Літаратура

BelTa. 2014. Belarus 23rd on global household Internet penetration list. http://eng.belta.by/society/view/belarus-23rd-on-global-household-internet-penetration-list-92-2015.

Durand, M., Giorno, C. 2004. Indicators of international competitiveness: conceptual aspects and evaluation. OECD. Available at: [http://www.oecd.org/eco/outlook/33841783.pdf].

IMD. 2014. IMD World Competitiveness Yearbook.

IMD. 2015. World competitiveness yearbook 2015. Available at: [http://www.imd.org/wcc/research-methodology/]

Kaufman, D., Kraay, A. 2007. Worldwide Governance Indicators Project: Answering the Critics. Available at: [http://papers.ssrn.com/sol3/papers.cfm?abstract_id=965077].

Kiel Institute for the World Economy. 2014. A New Global Index of Infrastructure: Construction, Rankings and Applications.

OECD. 1997. Industrial Competitiveness: Benchmarking Business Environments in the Global Economy.

Porter, Michael E. (1998), The Competitive Advantage of Nations, The Free Press: New York.

World Investment Report 2015. Belarus. http://unctad.org/sections/dite_dir/docs/wir2015/wir15_fs_by_en.pdf.

World Economic Forum. 2015a. Available at: [http://www.weforum.org/world-economic-forum].

World Economic Forum. 2015b. The Global Competitiveness Report 2014–2015. Available at: [http://www3.weforum.org/docs/WEF_GlobalCompetitivenessReport_2014-15.pdf].

Акулич, В., Валетко, В., Навродский, С., Сушкевич, Д. 2015. Беларуси есть место в рейтинге глобальной конкурентоспособности. http://case-belarus.eu/wp-content/uploads/2015/08/Belarus-in-GCI_19.08.2015_Final_SN.pdf

Скриба, Урютина. 2015. Состояние коррупции в беларуси в восприятии малого и среднего бизнеса. http://www.research.by/webroot/delivery/files/english/pdp/pdp2015r02.pdf.

Урютина. 2015. Каких реформ ждет белорусский бизнес. http://www.research.by/webroot/delivery/files/dp2015r06.pdf.

Чубрик, Шиманович. 2011. Среднесрочные перспективы экономики Беларуси после кризиса платежного баланса. http://www.research.by/webroot/delivery/files/wp2012r03.pdf